Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Сялянская Праўда

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Цана асобнага нумару 20 грош.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня**, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 грош., за радок пэтыту ў 1 шп

№ 12. Вільня, Нядзеля, 26-га кастрычніка 1924 г. Год I.

Збор ахвяраў на карысьць Беларускага прытулку у Вільні.

У ВАЎТОРАК 28 КАСТРЫЧНІКА адбудзецца ў Вільні **ЗБОР АХВЯРАЎ** на карысьць прытулку для беларускіх сірот і дзяцей бедных бацькоў.

Беларускі Камітэт помачы пацярпеўшым ад вайны, які апякуецца памянёным прытулкам, зьвяртаецца да беларускага грамадзянства і да ўсіх людзей добрай волі—з вялікай просьбай: **прыняць чыннае ўчасьце ў зборы, як сваей працай, так і ахвярамі.**

Усіх, ахвочых прыняць удзел у зборы, Камітэт просіць зьявіцца ў **панядзелак 27 Кастрычніка**, а **5 гадзіне** вечарам у памешканьне Беларускай Гімназіі (Вострабрамская вуліца, дом № 9) для нарыхтаваньня **падзелу працы** ў дзень збору.

Прысутнасьць усіх сяброў Таварыства помачы пацярп. абавязкова.

Пасьля экспозэ п. Грабскага.

Пад той час, як розныя нанятыя за грошы людзі ўсё „пацяшаюць беларусаў, што вось-вось польскі ўрад ужо дае ім усё патрэбнае,—сам урад зусім выразна заяўляе, што ён яшчэ нават не надумаўся, якое палітыкі дзяржацца ў адносінах да „беларускае меншасьці“...

Сьледам за віленскім „маніфэстам“ міністра асьветы п. Міклашэўскага нам прыходзіцца адзначыць выступленьне ў Сойме самога галавы ўраду, прэм'ера Грабскага. У сваей трохгадзіннай прамове п. Грабскі гаварыў аб „Усходніх Крэсах“ выключна *з пункту гледжаньня барацьбы з дывэрсыйнымі нападамі*, прычым прызнаўся, што ў яго нямашака ніякае праграмы „крэсавае“ палітыкі, ды што пры выпрацаваньні гэтае праграмы ён будзе апірацца на партыях, правеўшых законы аб мовах.

П. Міклашэўскі ў Вільні заявіў, што ўрад сёлета ня зьбіраецца правадзіць у жыцьцё закон аб беларускай школе. І—ў тон яму—галава ўраду з соймавае трыбуны заяўляе, што *„плады прац ураду ня могуць шыбка дасьпець“*. Бо — „праца над вызначэньнем польскае палітыкі на Крэсах — гэта ня чыннасьць дзеля эфэкту, а адна з падвалінаў будучага быту нашае дзяржавы“.

Так сказаў п. Грабскі. Дык чакайце, беларусы, пакуль "плады" ўрадавае працы „дасьпеюць“, — чакайце і не сьпяшайцеся, што польскі ўрад усьцяж аб вас думае!

Факты гэта пацьвярджаюць. Бо ў *працягу першага месяца дзейнасьці законаў аб школе ў роднай мове польскі ўрад зьліквідаваў апошнія ўрадавыя беларускія школы, існаваўшыя колькі гадоў, і не адкрыў ніводнае новае*, ня гледзячы на кучы сялянскіх прыгавораў!....

Польскі ўрад думае аб нас і калі справа йдзе аб *зямлю ды адбудову*. Бо ў той час, як наш малазямельнік есьць хлеб з мякінай і гніе ў зямлянцы, ня маючы дрэва на адбудову,—п. Грабскі ў Сойме заяўляе, што ў бюджэце на 1925 год на парцэляцыю і камасацыю зямлі ды на адбудову вызначана сума *больш за 100 міліёнаў злотых, але... для асаднікаў і „польскае вёскі“*!

Так польскі ўрад думае аб нас. Ды гэта ня ўсё: польскі ўрад думае яшчэ і аб тым, каб, узяўшы наш лёс у свае рукі, ня даць „баламуціць“ нам паслом: пракуратура, як нас паведамляюць, паслала ў Сойм дамаганьне выдачы ей цэлага раду беларускіх паслоў,—і п. Грабскі піша маршалку Сойму ад сябе пісьмо, каб гэту справу прысьпяшыць...

Дык будзьце спакойны, беларусы: аб вас „памятаюць“!

Але абавязкам і нашым, і нашых паслоў павінна быць: *не выжыдаць*, пакуль „плады“ працы ўраду „дасьпеюць“, а гэтых пладоў *дабіцца ўраз*. Не дарма кажа прыказка: пакуль сонца ўзыйдзе, раса вочы выесьць!

Мы ўжо даволі ждалі, даволі ела нам вочы раса! Мы больш ждаць *не павінны і ня можам*.

Польскі ўрад, паправіўшы сваю „рэпутацыю“ заграніцай „языковымі“ законамі, можа цяпер ждаць—і жджэ „будучага году“. Мы павінны падняць свой магутны голас проці гэнага „выжыданьня“, мы павінны паказаць усяму сьвету, што нават і гэныя „языковыя“ законы, якія кідаюць нам нейкія крошкі волі з „панскага стала“, існуюць *толькі на паперы—толькі „на вываз“*!

Кожны сялянскі прыгавар аб роднай школе, кожная просьба аб пертварэньні польскае школы на беларускую, кожнае дамаганьне новае беларускае школы,—усё гэта павінна быць *знакам нашага пратэсту проці панскага* „роcцеkaj!“ І няхай сабе паны школьныя інспэктары кладуць гэтыя прыгаворы і просьбы пад сукно, няхай наша родная школа істнуе пакуль што тайна, як колькі ўжо год у Львове істнуе тайны украінскі унівэрсытэт,—ды ўсе яны разам зложацца ў такі моцны крык жалабы і пратэсту, што яго не здалеюць заглушыць ні генарал-ваяводы, ні „падзячныя гымны“ розных нанятых за грошы здраднікаў нашага народу, сьпяваньня паном міністрам.

Выкарыстаць гэты голас нашага народу—*задача беларускіх паслоў*. Калі Сойм выдасьць пракуратуры таго ці іншага беларускага дэпутата, яго заступіць ураз-жа другі. Тэрор не запалохае нашых выбраннцаў, бо яны ведалі, што мы іх выбіралі не на салодкае бязьдзейнічаньне, а *дзеля барацьбы за нашае права і нашую волю*.

І мы верым, што ў канцы *наш народ пераможа!* Толькі ня сьпіце, людцы, ня слухайце здрадніцкіх падшэптаў, што „ўжо ўсё нам дадзена“, „ўсё будзе добра“. Бо *ня будзе нам дабра, калі ня будзем самі сільнымі, сьвядомымі, арганізованымі*.

П. Міклашэўскі не дарма казаў у бытнасьць сваю ў Вільні, што ўрад будзе лічыцца з тымі беларускімі дамаганьнямі, за якімі стаяць масы, за якімі стаіць сіла народная. Дык—*будзьма-ж сільнымі!*

Ніколі не зьнішчажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаемаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

„Грамадзянская самаабарона“ і самасуды на „Крэсах“.

„Kur. Por.“ падае зьмест характэрнай адозвы, выпушчанай новапаўстаўшым „Валынскім Камітэтам Самаабароны“ (—польскім):

„Грамадзяне! Вашы дамы, маёнткі і сем'і—ў небясьпецы з боку бандаў, нанятых бальшавіцкімі жыдамі. Улада не дае нам належнай аховы і абароны, дзеля таго мы з'арганізавалі ўласную абарону. Ад гэтага дня заклікаем усіх гэных людзей да абароны. Адначасна мы перасьцерагаем, што кожны, хто памагацімець бальшавіцкім бандам—ці ўкрываючы сяброў бандаў, ці даючы ім якія-небудзь інфармацыі,— **будзе ўкараны сьмерцяй і спаленьнем усяе яго маемасьці.** У патрэбе мы ня спынімся перад спаленьнем цэлай вёскі.

Wolyń, 1924 r.

Wolyński Komitet Samoobrony.

„Kur. Por.“ слушна кажа, што „зьмест гэтай адозвы — такі радыкальны (!), што гэты Камітэт ня можа быць цярпімы ў гаспадарстве нават у зародку“. „Расправа самасудам“ — спосаб чыста рэвалюцыйны і выклікае ў далейшым самасуды таўпы, якія гранічаць ужо з поўнай анархіяй“...

„Мэксыканскія спосабы ўзаемных распраў у пабудаванай на праве Польшчы ня могуць мець мейсца нават у мысьлі“.

Хто-ж... кажа няпраўду?

Мы, з вядомых прычын, ня лічым магчымым весьці палеміку з так зван. „Грамадзкім Голасам“, але павінны зьвярнуць увагу на нешта ў ім запраўды цікавае.

Наша газэта падала віленскія рэвэляцыі пана мін. Міклашэўскага—так, як яны былі надрукаваны ў яго „ўласным“—бо партыйна-эндэцкім органе „Dz. Wil.“.

П. Міністар асьветы выразна сказаў, што ў гэтым годзе ўрад будзе толькі „орыентавацца“ „ў палітычнай сіле беларускіх арганізацыяў, але ў жыцьцё новыя школьныя законы пачне праводзіць толькі ў наступным вучэбным годзе.

Мы **паверылі** (і вельмі шчыра!..) п. міністру Польскае Рэспублікі, паверылі, што ён раскрыў нам запраўдныя свае пляны.

Вось як мы, „безадказная апазыцыя“ ўраду п. Грабскага, аднясьліся да слоў яго міністра асьветы.

Сам орган паноў Валэйшы і Паўлюкевіча сьцьвярдзіў у перадавіцы, што „Сялянская Праўда“ спрытна (і **точна! Рэд.**) падхапіла інфармацыі „Dz. Wil.“...

Але вось у тым самым № таго-ж самага „Грамадзкага“ голасу п. п. Валэйшы і Косьцевіча надрукавана „Адкрытае пісьмо“ калегі гэтых паноў, п. Паўлюкевіча, у якім аўтар, здаецца, не належачы да апазіцыі польскаму ўраду п. Грабскага, рашуча заяўляе, што міністар асьветы п. Міклашэўскі ў сваей прамове да віленскіх журналістаў.... казаў няпраўду...—бо яму, Паўлюкевічу, як п. мін. Міклашэўскі, таксама і адказны галава польскага ўраду казалі нешта зусім іншае—і проста процілежнае...

У сваім „пісьме“ п. Паўлюкевіч заяўляе найвыразьней, што ён і яго „Рада“ (п. п. Паўлюкевіч, Більдзюкевіч і Шышков) „дабіліся, пасьля вялікіх трудоў (якіх?), цэлага раду ўступак ад Польскага Ураду, маючых вялізарную культурна-нацыянальную вагу“: польскі ўрад мае ўжо ў бягучым вучэбным годзе адкрываць беларускія школы, даручыўшы гэтую справу п. Паўлюкевічу і яго „Радзе“ і нават не чакаючы, пакуль п. мін. Міклашэўскі „zorjentuje się“ у „лічэбнай сіле“ і „wpływach na masę гэтай „Рады“...

Цяпер трохі хронолёгіі. „Паны Рада“ езьдзілі ў Варшаву раней, чым прыехаў у Вільню п. Міністар асьветы; п. міністар зрабіў свае заявы журналістам пасьля абеду і „чорнай кавы“—ў апошні мамэнт перад выездам, пасьля чаго зараз-жа і паехаў на вагзал і вярнуўся ў Варшаву.

Калі ж п. Паўлюкевічу і яго „Радзе“ „ўдалося дабіцца“ ад міністра і польскага ўраду тых „вялізарнай культурна-нацыянальнай вагі ўсту-

пак"—а ў першую чаргу—правядзеньня закону аб школе ўжо ў бягучым годзе?..

Ясна, што або п. Міклашэўскі, або п. Паўлюкевіч сказаў няпраўду. Але хто?

Па „чалавечаму" судзячы, думаем, што... п. Паўлюкевіч!

Калі хтось, яшчэ толькі **маючы надзею нешта атрымаць** ад „пана", галасна кажа (каб і пан чуў...), што добры і разумны пан **ужо даў** яму ўсё, што ён прасіў, а сам пан, нават пасьля „чорнай кавы" яшчэ галасьней заяўляе, што — **ня даў нічога і ня дасьць**, дык заўсёды асьцярожней паверыць... пану.

І мы верым у гэтым выпадку п. Міклашэўскаму, сцьвярджаючы, што ўсе „заваяваньні" п. Паўлюкевіча і ягоных „кумпанаў"—гэта нягодная мана, каб абаламуціць наш народ і спыніць ягоную барацьбу за сваю родную школу.

Што-ж датычыць прэтэнсіі п. Паўлюкевіча да нашай „лаянкі", дык мы павінны вытлумачыць яму (калі сам не разумее!), што іншая рэч назваць „крыміналістам" чалавека ні ў чым нявіннага—гэта—лаянка; а іншая рэч назваць гэтак чалавека, двойчы засуджанага судом у арыштанцкія роты за розныя машэнствы. Гэта ўжо—ня лаянка, але точны назоў рэчы...

Дык **лаянкай** наша газэта не займаецца. Гэтая „спэцыяльнасьць" прыналежыць калегам п. Паўлюкевіча, выпусьціўшым бяспрыкладна брудны і сальны лісток пад назовам „Абух". Ім няхай п. Паўлюкевіч і чытае свае нотацыі, бо,—ня гледзячы на ўсю агіду, з якой наш народ сустрэў гэны „Абух",—як мы чулі, п. п. Валэйша і Косьцевіч рыхтуюць новае падобнае выданьне і.. хіба не бяз ведама, а мо' і ўчасьця калегі Паўлюкевіча!...

Сямёхгодняя воля.

Сем гадоў мінула з тэй пары, як Народы Расейскай Дзяржавы разам з Народам Беларускім вызваліліся з-пад царскага панаваньня. Цікава зрабіць падрахунак, што здабыў за гэты час беларускі вызваленчы рух у сваім рэвалюцыйным поступе і якія ён прайшоў этапы.

Зразу пасьля кастрычнікавай рэвалюцыі ўсе бяз вынятку беларускія партыі, прыслухоўваючыся да голасу беларускага працоўнага люду і карыстаючы з права самавызначэньня, выкінулі лёзунгі дзяржаўнай незалежнасьці. Усе партыі шлі пад гэтым штандарам, і дзяржаўная незалежнасьць была самым баявым праграмным заданьнем усіх палітычных груп. Толькі ня ўсе беларускія партыі прыйшлі да паразуменьня, якім парадкам здабыць гэтую незалежнасьць і ў якой форме гэтая незалежнасьць мае выявіцца. Беларускія камуністы дабіваліся, каб беларускі працоўны народ будаваў сваю Сацыялістычную Рэспубліку побач з вызваліўшыміся народамі царскай Расеі. Усе-ж другія партыі, як с.-д., меншавікі, сацыял-фэдэралісты, сацыял-народнікі і, некаторы час, рэвалюцыйныя сацыялісты захацелі будаваць незалежна сваю Народную Рэспубліку. Але жыцьцё зьдзейсьніла ідэал камуністаў.

Цяжка было беларускаму народу, меўшаму зусім мала ўласнай інтэлігенцыі, прыступіць да дзяржаўнага будаўніцтва, і толькі цяпер, калі ён карыстаецца незалежнасьцяй, хаця толькі ў аднэй частцы Бацькаўшчыны—ў Радавай Беларусі, можна бачыць, на якія вялікія чыны ён можа здабыцца і якое велікае творчае багацьце ляжыць у яго гушчы.

Цяпер Беларуская Рэспубліка, ў склад якой уваходзяць усе ўсходня-беларускія землі з Менскам, Віцебскам, Полацкам і Магілёвам, дзеліцца на дзесяць акругоў, а кожны вокруг на дзесяць райёнаў. Законадаўчая ўлада ў ёй належыць да Усебеларускага Зьезду Рад і Выканаўчага Камітэту, які выбіраецца Зьездам. Выканаўчая-ж улада належыць да Рады Народных Камісараў, якая зьяўляецца адказнай за сваю працу перад усім працоўным народам Беларусі.

Як кожны асобны работнік дзеля таго, каб лягчэй бараніць свае правы, зьвязываецца з другімі работнікамі ў Саюз, так і Беларуская Рэспубліка зьвязана з другімі вызваліўшыміся Народамі ў Саюз Сацыялістычных Радавых Рэспублік.

Але тэрыторыя Беларускае Рэспублікі, паўтараем, зьяўляецца толькі палавінай этнаграфічнай Беларусі, бо другая палавіна з Вільняй, Горадняй, Беластокам, Пінскам і др. гарадамі па Рыжскаму міру ўвайшла ў склад Польскай Дзяржавы.

Важным здабыткам нашага вызваленчага руху за апошнія сем гадоў зьяўляецца таксама эканамічнае вызваленьне, г. зн. вызваленьне беларускага работніка і селяніна з пад уціску фабрыканта і абшарніка, а таксама вызваленьне культурнае, вызваленьне Беларускага Народу з тэй цемнаты, у якой трымалі яго панскія і царскія ўрады.

Так, напрыклад, на невялікім абшары Радавае Беларусі істнуе некалькі вышэйшых школ, як Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт і Сельска гаспадарчы Інстытут у Менску, Пэдагагічны Інстытут у Магілёве і Сельска-гаспадарчы Інстытут у Горках. Цэлая сетка тэхнікумаў, беларускіх пачатковых школ і курсаў для дарослых пакрывае абшар Усходняй Беларусі. У Менску месьціцца Беларускі Дзяржаўны Тэатр і Лятучы Тэатр, які езьдзіць па вёсках.

Але, здабыўшы даной кастрычнікавай рэвалюцыі ўсе гэтыя вольнасьці, Беларускі працоўны народ не забыўся і аб тых нацыянальных меншасьцях, якія жывуць сярод яго. У той час, калі польскі ўрад ніяк ня можа зрэалізаваць нават такіх мізэрных „языковых" законаў, у Беларусі палякі карыстаюцца поўным раўнапраўем. Сярод Беларускіх Народных Камісараў ёсьць таксама і палякі. Есьць шмат польскіх школ і пэдагагічны тэхнікум.

Такімі-ж правамі карыстаюцца жыды і расейцы.

Значыцца, Беларускі Працоўны Народ ня будуе сваёй свабоды на крыўдзе другіх народаў, а, наадварот, наша воля прыносіць волю ўсім, хто жыве на нашай зямлі. **Х.**

З Сойму.

Прамова прэм. Грабскага ў Сойме.

На першым паседжаньні Сойму прэм. Грабскі сказаў прамову, у якой даў агульны агляд, як міжнародавай, так і ўнутранай палітыкі Польшчы.

У часьці, ахфярованай заграмічным справам, аратар заявіў, што Польшча была-б зусім спакойная за сваю будучыну, калі-б Расея і Нямеччына... зьмянілі б сваю псыхіку і пачалі шанаваць сучасныя граніцы Польшчы. Ён выразіў свае нездаваленьне тым, што дзяржавам, некалі падзяліўшым Польшчу, прапануюць цяпер месца ў Лізе Народаў—вышэйшае, як Польшчы.

У галіне ўнутраных спраў прэм'ер заявіў, што ўрад прызнае дрэннасьць крэсавай адміністрацыі і... прыступае да яе „направы", што мясцовае насяленьне на „Крэсах" павінна адчуць (!) і зразумець, што польская ўлада ня толькі трэбуе паслухмяннасьці, але і рупіцца аб дабрабыце гэтага насяленьня. Дзеля гэтага ўрад і стварыў... асобнага дэлегата ўраду на „Крэсах", які ўжо назначаны і дастаў вялікія паўнамоцтвы... Праца ўраду на „Крэсах"—фундамант будучыны Польскае дзяржавы...

Далейшая праца Сойму.

Пасьля паседжаняня, на якім прэм. Грабскі зрабіў свае экспозэ, пленуму Сойму ня будзе аж да аўторка,—каб даць магчымасьць фракцыям заняць становішча да гэтага экспозэ і падрыхтавацца да дыскусіі.

Газэты падаюць, што большасьць фракцыяў заняла крытычнае становішча да прамовы і праграмы прэм. Грабскага, прынамся ў паасобных галінах дзяржаўнае палітыкі ўраду. Настрой P.P.S.—наагул пэсымістычны, ад'емны. Жыды ў апазіцыі. Аб рэшце меншасьцяў, асабліва беларусах і ўкраінцах, няма чаго й казаць, нават хадэкі (карфантаўцы) рэзка высказываюцца проці паасобных міністраў.

Ці будзе з гэтай усей „крытыкі" які практычны вывад, паглядзім.

48... „баранаў"—на зарэз.

Старшыня Сойму далажыў на канвэнце сэньёраў, што ім атрымана ад прэм'ера Грабскага пісьмо, у якім галава ўраду просіць прысьпяшыць разгляд рэгуляміновай камісіяй 48 пракурорскіх „wniosków" аб выдачы 48 паслоў за „процідзяржаўную дзейнасьць". За тры месяцы вакацыяў, відаць, прагаладаліся...

Як нас паведамляюць, у ліку гэтых 48 — каля дзесякту нашых беларускіх паслоў.

„Праца ўраду на „Крэсах"—фундамант будучыны Польшчы", як відаць ня спыняецца.

„Дыябалізацыя" рэгулямінавай камісіі.

Цікава, што парадак правядзеньня справы выдачы паслоў камісіяй зьменены: дагэтуль дакладчыкам зьяўляўся прадстаўнік **тэй-жа партыі**, з якой пракурор хацеў вызваць „Барана", а цяпер дакладываць **будзе прадстаўнік праціўнае партыі**. Карыстаючыся старой сярэднявечнай каталіцкай тэрміналёгіяй, можна сказаць, што на працэсе „ў камісіі дагэтуль" няпрыемнага п. пракурору пасла **абяляў і бараніў** „advocatus Dei" (адвакат Бога), а цяпер яго будзе **чарніць і вінаваціць** „advocatus diaboli" (адвакат чарта). І трэба адзначыць, што гэтая **„дыябалізацыя"** рэгулямінавай камісіі ня суліць нічога добрага паслам, а перад усім паслам меншасьцяў.

Дыскусія над экспозэ прэм. Грабскага.

Дыскусіяй над урадавым экспозэ будуць заняты толькі 3 дні: аўторак, серада і чацьвер, прычым голас атрымае толькі адна „калейка" аратараў.

П. Тугутт і „Wyzwolenie".

Справа павароту п. Тугутта да партыйнай „macierzy" вырашана аканчальна — **адмоўна**. Дзеля таго ўрад партыі пастанавіў адазваць п. Тугутта з становішча старшыні адміністрацыйнай камісіі.

„4 грошы за злоты".

(Даклад міністра „reform rolnych").

На апошнім паседжаньні зямельнай камісіі Сойму, на якім павінны былі разглядацца два праекты зямельнай рэформы—ўрадавы і „Wyzwolenia", увесь час, адабраўшы слова дакладчыку, прамаўляў міністар „reform rolnych" п. Копчыньскі, які прасіў у канцы прамовы пачакаць яшчэ трохі—**хаця** 2 дні, неразглядаючы абодвых нягодных праектаў, бо міністар мае ўжо зусім гатовым новы праект, „калі наагул зямельная рэформа мае быць зьдзейсьнена", праз Сойм і ўрад. Міністар рэзка крытыкаваў працу сваіх папярэднікаў і чыноўнікаў сваіх „urzędów ziemskich" за іх бюракратызм і валакіту, з лічбамі ў руках паказаўшы, што ўсё, **зрэалізаванае ўрадам** у галіне зямельнае рэформы, адносіцца да таго, што ўрад **дэкляраваў, як 4 да 100.**

Гэта значыць, што польскія ўрады, як правіцовыя, так і лявіцовыя, выпаўняюць толькі $^{4}/_{100}$ ці 4% сваіх абяцанак і ўрачыстых дэклярацыяў.

Гэта значыць, інакш кажучы, што ўсе гэтыя ўрады—ў сярэднім—**па сваіх вэксалёх**, выдаваных народу за ўладу над ім, **плацілі пасьля толькі па 4 грошы за злоты.**

Але-ж мы ведаем, што гэтак плацяць па сваіх вэксалёх... банкруты!

Дык вось, сам новы міністар — з афіцыяльнымі лічбамі ўрадавай статыстыкі ў руках—зусім бясспрэчна, бо матэматычна! — даказаў, што польскі ўрад наагул (бо ўсе ўрады — і левыя, і правыя!) ў найважнейшай справе—зямельнай, з якой зьвязана, як істнаваньне самай дзяржавы, у якой на ральлі працуюць больш як 415 яе жыхароў!—**аказаўся банкрутам.**

Хай-жа палякі ўсіх партыяў добра зразумеюць гэтыя фатальныя лічбы свайго міністра „reform rolnych"...

А мы, беларусы, ужо даўно ўсё гэта зразумелі, бо—каму-ж ня ясна, што і гэтыя 4% агульнай сумы вэксалёў выплачаны „польскаму народу" — ў асобах яго асаднікаў—коштам нашага „крэсавага насяленьня" беларусаў і ўкраінцаў...

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Работніцкі рух.

Палажэньне ў Дамброўскім районе абвастрылася. Работнікі, якія ўжо колькі часу бастуюць, адмаўляюцца вярнуцца да працы. Адбываюцца чысьленыя мітынгі.

У Лодзі на сходзе дэлегатаў усіх работніцкіх саюзаў пастаноўлена заявіць фабрыкантам ультыматыўна, што, калі да панядзелку ня згодзяцца на павялічэньне платы, дык у сераду работнікі ізноў зьбяруцца і ўхваляць рашучыя крокі. Большасьць работнікаў дамагаецца прыбаўкі больш за 15%, кажучы, што кошт утрыманьня іх узрос на 100%.

Забастоўка студэнтаў у Львове.

На сходзе студэнтаў у Львове пастаноўлена абвясьціць аднадневную забастоўку на знак пратэсту проці таго, што міністэрства ня зьменшыла платы за навуку.

Суд над лунінецкімі партызанамі.

27-X Пінскі акружны суд—у даразным парадку—прыступіць да разгляду справы нападу на цягнік пад Луніноцом.

Пасьля вялікіх трудоў і высілкаў — пішуць польскія газэты — паліцыі ўдалося затрымаць... колькі дзесяткаў падазровых асоб, з якіх некаторыя (колькі?) прызнаны пасажырамі цягніка. 16 з іх і судзяць даразным судом.

„Rzeczpospolita" — ўласнасьць п. Корфантага.

Вядомы правадыр „хрысьціянскіх" акулаў-прамыслоўцаў („хадэкаў") п. Корфанты купіў у п. Падэрэўскага яго газэту „Rzeczpospolita", якая дагэтуль зьяўлялася органам „хрысьціянскіх" абшарнікаў („дубадэкаў").

Заграніцай.

Міжнародавы кангрэс радыкалаў.

У Булёні (Францыя) адбыўся міжнародавы кангрэс радыкальных партыяў. На зьезьдзе былі прадстаўнікі 20 дзяржаваў.

На апошнім паседжаньні кангрэсу пасол Домбскі заявіў аб далучэньні да гэтага міжнароднага паразуменьня радыкалаў і польскіх партыяў „Wyzwolenie", „Jedność Ludowa", пазнаёміўшы дэлегатаў з праграмамі гэтых партыяў.

Кангрэс апрацаваў статут міжнародавага паразуменьня радыкальных партыяў, якое ня будзе мець характару інтэрнацыяналу, — бо кожная партыя меціме поўную самастойнасьць, не мяшаючыся ў унутраныя справы другіх.

Паразуменьне мае на мэце зьдзейсьненьне дэмакратычных ідэалаў, узаемнае збліжэньне народаў, прапаганду міра, разьвязываньне міжнародавых спраў шляхам арбітражу (разьемчага суду).

Яшчэ напад на польскага ўрадоўца.

ПАТ падае —

19-X на ўрадоўца польскага консульства ў Маскве зроблены напад на вуліцы. Гэта ўжо пяты выпадак гэткіх нападаў у працягу 2 дзён. Польскі ўрад паслаў ноту пратэсту...

Даклад Чычэрына аб адносінах з Польшчай.

У зьвязку з нападамі на палякоў у Маскве цікава падаць тое, што казаў на зьезьдзе ВЦІК'а Чычэрын аб адносінах Польшчы да СССР.

„Міністар Скшыньскі, — сказаў Чычэрын, — як толькі да яго дайшлі чуткі, быццам я зьбіраюся асабіста прыехаць у Варшаву, пасьпяшыў заявіць, што ўсе спорныя справы вельмі добра можна абгаварыць і вырашыць з новым паслом СССР, калі ён прыедзе ў Варшаву, Войкавым. У разе пасьпеху гэтых перагавораў Польшча мела-б вялікія торговыя карысьці, а СССР — палітычныя.

Польскі генарал аб „першым Маршалку“ і „легіёнах“...

Пас. Лібэрман зрабіў інтэрпэляцыю ў справе беспадставўнай канфіскацыі пэпэсаўскай газэты ў Перамышлю мясцовым пракурорам. Зашто-ж канфіскавана газэта? — За точна прыведзеныя словы мясцовага вайсковага шэфа ген. Лятыніка, які, адмаўляючы ўчасьця яго войска ў—„uroczystościach legijonowych“ („Пілсудскіх“) сказаў літэральна, паводле інтэрпэляцыі, гэтак:

„Сёньня прыйшлі вы, паны, з урачыстасьцямі легіёнскімі, заўтра прыдуць жыды з сьвяткаваньнем здабыцьця Ерыхону, пасьлязаўтра ўкраінцы з Пятлюрай“.

Што датычыць самай вартасьці легіянераў з іх „вялікім“ правадыром, дык генарал выразіўся вельмі „krótko a węzłowato“: „Тыя з іх, што былі чагось варты, згінулі ў баёх, а тыя, што яшчэ жывуць, дык нічога ня варты“!..

Цікава аднак-жа характарызуе польскі генарал значную частку польскай арміі, складаючуюся з „жывых яшчэ легіянёраў... А іх правадыр мае — ня сёньня, дык заўтра — ня толькі вярнуцца ў чынную службу ў арміі, але—ў прыпадку вайны, як кажуць амаль ня ўсе ў Польшчы,—зьяўляецца тым „адзіным“, хто можа і мае стануць на чале ўсей польскай арміі, вядучы — яе да пэўнай перамогі...

„Але, каб былі магчымы гатыя перагаворы, насам-перш павінны спыніцца гэткія недапусьцімыя факты, як напады на нашых радавых чыноўнікаў у Варшаве і тасаваньне да іх фізычных гвалтаў, прычым акты гэтых гвалтаваньняў знаходзяцца ў сувязі з дзеяльнасьцю некаторых польскіх уладаў, а так-жа з сыстэматычнымі нападамі польскіх бандаў на нашу радавую тэрыторыю“.

Урад ССРР трэбуе здаваленьня.

Газэта „Сегодня“ падае, што ў зьвязку з выпадкам пабіцьця працаўніка радавага пасольства ў Варшаве, Кравчэнкі і авантурай з нейкім афіцэрам Сідоровым, — радавы ўрад зьвярнуўся да польскага з нотай, у якой трэбуе сьледзтва ў гэтай справе, пакараньня вінаватых і адшкадаваньня для Кравчэнкі.

Адначасна нота трэбуе, каб польскі ўрад афіцыяльна запярэчыў тым фальшывым весткам, якія польская прэса пусьціла аб гэтым выпадку, заяўляючы, што, пакуль гэтыя дамаганьні ўраду ССРР ня будуць выпаўнены, датуль радавы пасол ня прыедзе ў Варшаву...

Хто будзе францускім паслом у Маскве.

Францускае газэта „Matin“ падае, што паслом Францыі ў Маскве, пасьля ўзнаўленьня дыпляматычных адносінаў з ССРР, мае быць рэдактар заграцічнага аддзелу найвялікшай франц. газэты „Temps“, вядомы публіцыст Гэрбэт.

Гандi ў Бэрліне і радавы ўрад.

Як падаюць бэрлінскія газэты, у хуткім часе мае прыехаць у Бэрлін знамяніты правадыр індыйскіх незалежнікаў, рэлігійны рэфарматар і „прарок“ Гандi.

Радавы ўрад даручыў свайму паслу ў Бэрліне Крэстінскаму зрабіць вялікаму індусу ўрачыстае спатканьне і запрасіць яго ў гасьціну да Масквы.

На помач Крэстінскаму высланы з Масквы 4 індыйскія камуністы.

Адозва нямецкага ўраду.

Нямецкі ўрад зьвярнуўся да насяленьня Краю з адозвай, у якой тлумачыць роспуск парлямэнту. Адозва адзначае няздольнасьць да працы гэтага парлямэнту, меўшага лішне моцныя флянгі і за слабы цэнтр. Задача новых выбараў — стварэньне больш моцнага цэнтру, які б мог прадаўжаць палітыку, згодную з нацыянальнымі інтарэсамі.

Арышт камуністаў-паслоў у Нямеччыне.

Як толькі быў распушчаны нямецкі парлямант, дык зараз-жа паліцыя пачала шукаць дзеля арышту паслоў-камуністаў. Але злавіць удалася толькі аднаго...

Гэткая „нятыкальнасьць“ запраўды больш падобна да мышалоўкі — на ўзор нашых „свабодаў“ у часе выбарнай кампаніі...

Наглядная лекцыя і нашым „нятыкальным“...

ССРР пагражае Румыніі (?).

Паводле вестак з Рыгі, бальшавікі канцэнтруюць вялікія сілы ў райёне Днястра — на бэсарабскай граніцы. Усе прыгранічныя вёскі і месты перапоўнены войскам. Насяленьне эвакуецца ў глыб Расеі...

Зварот Румыніі да Лігі Народаў.

„Руль“ піша, што Румынія зьвярнулася да Лігі Народаў з просьбай—зьвярнуць увагу на пагражаючае міру становішча радавага ўраду і на концэнтрацыю чырвоных войск на граніцы радава-румынскай. Румынія просіць Лігу не дапусьціць да выбуху вайны.

„Руль“ дадае, што гэтую просьбу Румынія матывавала яшчэ і быццам падпісанай міжы ССРР і Вэнгрыяй тайнай ваеннай конвэнцыяй (умовай), якая ўскладае на Вэнгрыю рад важных крокаў, якія тая павінна выпаўніць яшчэ сёлета.

Гэтая конвэнцыя аканчальна напалохала Румынію, ня глецзячы на тое, што яе прэм'ер Братыяну толькі што сказаў ваяўнічую прамову, у якой выхваляў непераможную моц Вялікай Румыніі.

Выбары ў Англіі.

На выбарах у Англіі будуць кандыдаваць 42 кабеты, 3 іх — больш паловы ад Партыі Працы.

Безрабоцьце ў Англіі.

У Англіі лічба бэзработных усё расьце: за мінулыя 3 тыдні яна павялічылася аж на 50.000.

Англа-турэцкі канфлікт.

Турэцкі міністар заявіў, што Турцыя не прызнае ніякіх канцэсіяў — ні газавых, ні якіх іншых — на тэрыторыях, якія яна лічыць уласнасьцю турэцкае дзяржавы.

Трыумф ягіпецкаму прэм'еру.

Ягіпецкі прэм'ер, які рашуча дамагаецца ад Англіі звальненьня ягіпецкай тэрыторыі ад англійскіх войск і звароту Ягіпту захопленага Англіяй Судану, вярнуўся з Лёндану ў Каір (сталіца Ягіпту), уся падарожа яго па краю абярнулася ў рад урачыстых маніфэстацыяў на чэсьць гэтага барца за вызваленьне Ягіпту з англійскай няволі.

Бойка ў Югаслаўскім парляманце (Скупшчыне).

Апошняе паседжаньне Скупшчыны прадаўжалася толькі 10 мінут. Бо пачалася такая бойка паміж „радыкаламі (фактычна крайнімі нацыяналістамі) і „апазіцыяй“ (?—якраз сучаснай урадовай большасьцяй!) што прышлося зачыніць паседжаньне.

Некалькі паслоў ранены.

Пасьля перарыву Старшыня Іованавіч заявіў, што, з прычыны адстаўкі ўраду, ён адкладае паседжаньне, пакуль ня створыцца габінэт.

Як ведама, місія Іовановіча ўтварэньне коаліцыйнага ўраду дэмакратаў з „радыкаламі“ не ўдалася, бо пашычаўцы запрасілі такую цану, што фактычна „коаліцыя“ ператварылася-б у той самы стары ўрад Пашыча.

Дык думаюць, што кароль змушаны будзе—хочня хоч—даручыць ізноў утварэньне габінэту Давідовічу, можа змусіўшы яго, калі ён пойдзе на гэта, абмяжаваць, як найбольш, уплывы ў габінеце вядомага Радіча, якога, ня гледзячы на ўсе яго шчырыя заявы аб ляяльнасьці і жаданьні сужыцьця і мірнага супрацоўніцтва свайго народу (харватаў) з сэрбамі,—але на варунках роўнасьці!—усё-ж такі і кароль і яго сэрбскія „радыкалы“ лічаць „камуністам“ і „антыпаньствоўцам“.

Новая змова ў Партугаліі.

З Лісабону наказуюць, што паліцыя выкрыла ў сталіцы новую змову проці сучаснага ўраду. Арыштаваны 11 сябраў выканаўчага камітэту загаворшчыкаў, паміж імі — жаўнеры. У Лісабоне адначасна адбыліся выпадкі бунтаў проці высокіх падаткаў.

Кітайская хатняя вайна.

З Лёндану наказуюць, што войскі Чонг-Со-Ліна адступілі ад Шанхаю на 10 міль, а войскі Ву-Пэй-Фу перайшлі ў наступленьне (?). Паводле Пэкінскіх вестак войскі цантральнага ўраду атакавалі порт з мора, каб акружыць паўстанцаў з тылу (?).

Быццам яны занялі ізноў Шанхай.

„Над-Цэпэлін“.

Амэрыканска-нямецкая фірма будуе цэпэлін, які будзе ўдвая больш таго, што пляцеў з Нямеччыны ў Амэрыку, гэта значыць, будзе даўжынёй каля поўвярсты

ХРОНІКА.

ГРАМАДЗЯНЕ! Памятайце, што ў аўторак, 28 кастрычніка, у Вільні адбудзецца вулічны збор ахвяр на Беларускі Прытулак!

Памажыце нашым бедным дзеткам!

У Віленскай Беларускай Гімназіі для вучняў і вучаніц уведзена новая форма: шэрыя шапачкі з ініцыяламі гімназіі на трыкутніку нацыянальных колераў і з залатым шнурочкам. Для хлапцоў—з чорным брылем, для дзяўчат—бяз брыля.

Сход праваслаўнага духавенства. 1-га кастрычнага, як піша „Słowo“, у Вільні пад кіраўніцтвам япіскапа Хвядоса адбылася нарада праваслаўнага духавенства, на якой зроблены гэткія пастановы:

1) ува ўсіх царквах служыць па стараму стылю;

2) з прычыны пашырэньня агітацыі баптыстаў, адпраўляць што-нядзелю адумысную службу з акафістамі;

3) заявіць пратэст проці закідаў, зробленых у органе варшаўскага мітрапаліта Дзяніса „Воскресное Чтеніе“ патрыарху Ціхану.

„Перапісь 1921 году“. Рэзультаты перапісі насяленьня, адбыўшаеся ў 1921 г., дагэтуль яшчэ не апрацаваны.

У 1922 г. гэтай працай займалася 900 асоб, у 1923 г.—400, у 1924 г.—200, але ўсё яшчэ працы ня скончылі. Матар'ял перапісі, гэта — 6.500.000 анкетных лістоў, уложаных у 1.300 вязках, якія важаць 120.000 кілягр. Можа да новага году праца будзе скончана.

Так пішуць віленскія газэты.

Можам толькі дадаць, што ўся гэтая праца, адняўшая час у стольках людзей, каштаваўшая нямала грошаў,—з навуковага боку ня варта нічога. Дзеля таго няма чаго і сьпяшацца яе канчаць: можна проста прадаць гэтыя 120.000 кілягр. паперы — „на паперу“.

1921 год!—гэта-ж год, у якім толькі і было мовы, што аб „плебісцыце“ ў „Сярэдняй Літве“, ды аб „Віленскім Сойме“, ды аб „wcieleniu do macierzy“. Дык і перапісь мела чыста палітычнае заданьне, а як яна рабілася, якія „інструкцыі“ мелі ўсе „перапішчыкі“, і тыя „вучоныя спэцыялісты“, якія кіравалі ўсей працай,—усё гэта добра ведама ўсім, і ніхто гэтым не абаламуціцца...

Wszystko „w swoim czasie“.

(Пісьмо у Рэдакцыю).

У марцы гэтага году паміж урадоўцамі была абвешчана падпіска на акцыі Польскага Банку. Плата за акцыі была разложана на 6 месячных ратаў, так што за паўгода кожны падпішчык меў атрымаць лічбу акцыяў, на якую ён падпісаўся. Падпісваліся на акцыі ня толькі стабілізаваныя ўрадоўцы, але і тыя, аб якіх кіраўнікі ўрадаў ужо далі благую апінію і якіх у першую чаргу павінны былі зрэдукаваць — бо як не падпісацца, калі кіраўнік асабіста пасылае за падуладным і прапануе яму падпісацца?

Пэўна-ж, што не адна сотня такіх падпішчыкаў цяпер звольнена са службы, і ім цяпер вельмі прыдаліся-б гэтыя акцыі, бо ёсьць такія, якія ня маюць абавязкаў і сядзяць бяз хлеба. Апошнюю рату яны выплацілі 1-га жніўня, і ўжо 3 месяцы чакаюць і ня могуць дачакацца гэтых акцыяў.

Зьвяртаецца падпішчык да Польскага Банку ў Варшаве. Банк прапануе зьвярнуцца беспасрэдна да Міністэрства Скарбу (Departament obrotu pieniężnego), як да інстытуцыі, якая прыймала ад паньствовых ураднікаў ратную падпіску на акцыі Польскага Банку.

Зьвяртаецца пашкадаваны да Міністэрства Скарбу і атрымоўвае дасłоўную адповедзь:

„Ministerstwo Skarbu zawiadamia Pana na skutek zażalenia z dnia....b. m., że z powodu znacznej liczby subskrybentów nie jest w stanie załatwiać indywidualnie pojedyńczych osób, żądających wydania akcyi Banku Polskiego.

Po przygotowaniu imiennych akcyj przez Bank Polski będą one w swoim czasie rozesłane poszczególnym subskrybentom“.

Za Ministra Skarbu
Nacz. Wydz. (—).

Нам здаецца, што з прычыны значнай лічбы падпішчыкаў, тым лягчэй было прыгатаваць акцыі і што акцыяў за свае крывавые грошы жадаюць атрымаць не адзінкі, але ўсе, ня толькі зрэдукованыя, але і ўрадоўцы на службе. Цікава, што нават часу выдачы акцыяў Мін. Скарбу не падае, а пацяшае тым, што „w swoim czasie“ яны будуць разасланы асобным падпішчыкам.

А. Б.

З жыцьця Горадні.

Прывід вайны.

На днях ускалыхнулася ўсё стаячае жыцьцё Горадні пачуткамі, быццам пачалася вайна! Прычынай гэтых пачутак паслужылі тыднёвыя зборы ахвяр на будову арэапляпаў. Апрача таго, праз Горадню праехала шмат войска — гэта ўсё для абароны „Kresow“.

Памятаем, як праз гэтую-ж Горадню плылі цягнікі з „штатнымі“ выбаршчыкамі. Справіўшыся на Шлёнску, ехалі яны на Віленшчыну, каб далучыць да „macierzy“. Вось, і далучылі, а цяпер бадай і самі ня рады...

Аб беларускай школе.

Адзіная беларуская школа ў Горадні знаходзіцца ў страшэным заняпадзе. Сёлета, напрыклад, забаронена выкладаць Гісторыю Беларусі і Геаграфію па падручніку Смоліча. Апрача таго, аж да гэтага часу, хоць школа істнуе ад 1916 г., не дазваляюць адчыніць апошняй клясы, і вучні змушаны, каб скончыць школу, паступаць да польскай.

Жыцьцё палітычных арыштаваных.

Усіх арыштаваных за палітычныя справы сядзіць у Горадзенскім вастрозе да 300 асоб, з якіх налічваецца каля 170 беларусаў. Двое арыштаваных не перанесьлі цяжкіх варункаў казаматнага жыцьця і памерлі да суда, тры, зусім занядужаўшы, ляжаць у вастрожным шпіталі. Адміністрацыя ня толькі не стараецца палепшыць варункі, але робіць усе, каб пагоршыць жыцьцё няшчасных.

Пасол Баран, які таксама сядзіць у Горадні, хоць здароўем слаб, але крэпак духам. Трэба канешна, каб наш пасольскі клюб паклапаціўся аб арганізаваньні матар'яльнай дапамогі вязьням.

Цукру няма.

Раптам зьнік цукер у Горадні і ня толькі ў жыдоўскіх, але і ў самых „патрыятычных“ крамках, дзе вісяць абразы, партрэты Галера і іншае. Аказалася, што ўрад ня толькі дазволіў цукернікам павялічыць рабочы дзень, а і павялічыць цану на цукер—(калі мёд, дык і лыжка!)

Вось крамнікі і пахавалі цукер, каб дачакацца новай павялічанай цаны.

Польскі тэатр.

Мясцовы польскі тэатр ледзьве дыхае. На прадстаўленьне прыходзе столькі, што на пальцах можна пералічыць, а каса тэатру добра, калі са сто злотых назьбірае. Дырэкцыя тэатру ўсялякімі сродкамі і спосабамі хоча прывабіць публіку, але тэатр пустуе.

Рэч натуральная, урадоўцы — палякі ня мо-

гуць запоўніць тэатру, а жыхары Горадні, беларусы і жыды неахвочы да сучаснага горадзенскага тэатру: адно што ён у польскай мове, якую тут туга цямяць, а другое—дык рэпэртуар падбіраецца такі, ад якога веець затхласьцяй і кансэрватыўнасьцяй. Тэатр гэты кіруецца выключна на здаваленьня перасычанай буржуазіі, якая наагул усюды мала цікавіцца тэатрам. Не паможа і нядаўна заснаванае „Tow. Popiczania Polskiej sceny“. Тэатр будзе пуставаць, аж пакуль не прыблізіцца да шырокай працоўнай масы, якая ня толькі пакінута законам, але і забыта польскім грамадзянствам.

Тут трэба адзначыць, што беларускія спэктаклі карыстаюцца вялікай папулярнасьцяй, і ахвоча іх наведываюць. Разумеецца, гэта няўруку сучасным верхаводам, і беларускаму народнаму тэатру робяцца розныя перашкоды, каб толькі яго ня было, але горадзенцы пэўны, што ён будзе, і цярпліва чакаюць.

Карэспандэнцыі.

Школы няма.

(*в. Верцялішкі, Гарадзенскага пав.*).

Была ў нас некалі беларуская школа, але ось ужо два гады, як зачынена. Хацелі-б ізноў адчыніць, хоць-бы на свой кошт, а няма каму паклапаціцца, кожны баіцца: што-ж, цяпер часы такія неспакойныя! Добра было-б, каб хто з паслоў прыехаў. Мы чулі, што паслы езьдзяць па ўсей Зах. Беларусі, толькі чамусьці нашу Гарадзеншчыну абмінаюць.

Як пасадзілі нашага пасла Сяргея Барана, дык няма каму нават пажаліцца на свае крыўды.

Л—ч.

За школу — пад арышт!

(*Лашанская вол., Гарадзенскага пав*).

Вучыцель Аршун маніўся адчыніць у нашай валасьці некалькі беларускіх школак і даручыў другому вучыцелю Баліцкаму з'арганізаваць сходы, каб вынесьці адпаведныя прыгаворы. Але ўжо пасьля першага сходу ў справе школы Баліцкага заарыштавалі і пратрымалі некалькі дзён. Так мы і далі спакой з школамі, бо выходзіць, што „аднэй рукой даюць, а другой б'юць“.

Ар—н.

Жыві, як хочаш!

(*З Пружанскага пав.*).

У нашу вёску Жадзен, Дабучанскае гм., з 29 на 30 верасьня прыехаў войт, пісар і два паліцыянты сцягіваць страхоўку. А так, як у сялян ня было грошы (скуль-жа яны будуць брацца?), дык яны і пачалі браць рэчамі: у Аляксея Кірая забралі 7 мяшкоў, у Якуба і Янкі Кашак забралі хамуты, у Міхася Каша кажух, у Васіля Жука кажух і пальто і г. д. Наагул бралі, што папала пад руку, нат' пасьцелі. Усе забраныя рэчы злажылі на воз і павязьлі ў гміну.

Ад'яжджаючы, пісар нас „пацешыў“, кажучы, што гэта не апошні раз, а прыедуць яшчэ.

Відавочнік.

Вечарынка.

(*Вёска Вялікая-Ліпа, Нясьвіжскага пав.*).

У ва ўторак 14 кастрычніка, як і кожнага году, у нашай вёсцы адбыўся царкоўны фэст „Пакравы“. Людзей зышлося надта многа, бо, ведама-ж, стаяла добрая пагода.

Наша мясцовая пажарная каманда наладзіла на вечар гэтага дня вечарынку: згулялі твор Д. Марцінкевіча „Пінская Шляхта“. Гульня наагул удалася добра, калі зьвярнуць увагу, што артысты нашы — простыя ліцаўцы ад плуга — касы і прасьніцы - кудзелі.

Пасьля прадстаўленьня царкоўны хор прапяяў некалькі беларускіх песень.

Наастатку, вядомы ў нас на цэлую ваколіцу дзядзька Язэп сказаў некалькі слоў аб беларускім руху, аб даўнейшай школе, цяперашняй палітычнай сітуацыі і языковых законах, аб беларускай літэратуры, дый прадэклямаваў вершы Коласа, а потым і свае ўласныя.

Уражаньне ад вечарынкі засталося мілае. Людзей было вельмі многа. Хацелася-б часьцей бываць на гэтакіх вечарынках.

Госьць.

Наш „пастыр“.

(*Іжанская гміна, Вялейскага пав.*).

Глухая наша старонка. Цяжка жывецца нам беларусам, асабліва маральна. Некаму нас пацешыць, супакоіць. Застаўся толькі адзін куточак у нашай душы, каторы ня быў зусім атручаны — рэлігія; але ад таго часу, як „osiedlił się“ у нашай парахвіі „батюшка“ Анатолі К...., і гэты, здавалася-б недатычны куточак, у якім схаранілася ўся наша надзея і радасьць і імкненьне да красы, забрудзіўся рукамі таго, хто мусіў асабліва асьцярожна з ім абыходзіцца.

Вёскі Слабада, Ляда, Берасьніха, Куліха і Канаціха (каля 1000 жыхароў) пабудавалі ў Слабадзе, пасьля сусьветнае вайны, царкву на ўласны кошт і забясьпечылі яе належным інвэнтаром.

Наша гміна, а тым балей вёска Слабада, мае апінію ў „власть имущих“—„bandycka gmina“, „bandycka wieś“; вось-жа гэтыя „бандыты“ і пабудавалі царкву і хацелі, каб у ёй калі-некалі адпраўлялася набажэнства. Дзеля гэтага сяляне нашага абводу ў канцы 1923 г. зрабілі пісьменную ўмову са сьв. нашае парахвіі А. К.... на гэткіх варунках.

Кажды гаспадар, падпісаўшы умову, дае па паўтара пуда жыта на карысьць „батюшкі“; збожжа ссыпана было зараз-жа па новым годзе (1924) і аддадзена К....; апрача ссыпкі, сяляне пасылаюць фурманку і прырыхтоўваюць спэцыяльна адпаведны для сьв. абед. У дадатак да ўсяго гэтага сяляне ў працягу зімы і вясны завязьлі не адзін воз дроў К...., хоць і самі іх купляюць.

З свайго боку сьв. К.... абязаўся: 1) адпраўляць паніхіду на нашым магільніку на Радаўніцу (першы аўторак пасьля сьвятой нядзелі); 2) адпраўляць абедню ў нашай царкве і асьвяньціць збожжа ў полі на Макавея (1 га жніўня); 3) адпраўляць абедню на Дзяды (перад Зьмітраўскай суботай) і 4) хаваць, хрысьціць і вянчаць (за шлюб даплачваецца належнасьць на царкву і царкоўныя расходы).

Дык як-жа выпаўняе ўмову сьв. К....?

На Радаўніцу ён, праўда, прыехаў і адправіў набажэнства. Перад Макавеем па ст. ст. сьв. К.... сказаў, што гэтае сьвята па нов. ст. ўжо прайшло, але ён можа служыць абедню і абыйсьці палі з працэсіяй, калі сяляне зьбяруць яму масла, яек і сала (у гэты час ў сьв. К. павінны былі адбыцца хрысьціны дачкі). Сяляне і гэта зрабілі. Але на Макавея сьв. К.... усё-ж такі ня прыехаў. На Узьвіжаньне сьв. К... наказаў прыслаць фурманку, што было і зроблена; сабралася шмат народу да царквы; з паўгадзіны званілі на абедню; але і тут наш сьв. зманіў — фурманка вярнулася без яго; народ разыйшоўся абураны. У гэты-ж самы дзень, змрокам, прыехаў у Слабаду К... з жонкай і пачаў прасіць сялян, каб памаглі яму прыняць архіерэя (сабраць прадуктаў); пасьля кароткае размовы, якая скончылася лаянкай, ён паехаў дамоў,—водгуку з боку сялян, разумеецца, ня было.

Дык вось як сьв. К...., наш духоўны пастыр, падзякваў нам за ўсё нашае добрае і яшчэ пагражае, што, як толькі праедзе архіерэй, тады ён нам пакажа—заламае цану за шлюб 15—20 даляраў! Відаць, што ў сьв. К.... моцна трымаецца дух Врангелеўскага афіцэра (ён—быль Врангелеўскі афіцэр).

Але, каб пазбыцца зьдзеку з боку сьв. К.... над намі, злажылі архіерэю Хвядосу ў часе яго праезду па Іжанскай парахвіі 6 кастрычніка г. г., дзьве скаргі.

Цікава, як на гэта зарэагуе архіяпіскап Хвядос?

Слабаджанін.

Перапалох на пастарунку паліцыі ў Проньках.

(*Сьвянцянскага павету*).

У пачатку кастрычніка г. г. каля з. Балашы Занарацкае гміны, Сьвянцянскага пав., быў такі выпадак. Недалёка ад м. Кабыльнікі жыве гаспадар, які мае трох сыноў. Два з іх былі ўвёсь час у горадзе і толькі летась вярнуліся дамоў; трэці знаходзіўся пры бацьку і разам кіраваў гаспадаркаю свайго цесьця каля з. Балашы. Вярнуўшыхся сыноў з гораду бацька да сябе ня прыняў. Адзін з іх лічыў вінавайцам у гэтым трэцяга брата і чакаў адпаведнага мамэнту для помсты. Прыпільнаваўшы брата, які вяртаўся з м. Кабыльні дамоў, ён выстраліў з рэвальвэра і раніў у шыю. Ранены схапіў за руку нападаючага і падняў крык. Прыбеглі суседзі, аднялі рэвальвэр і павялі нападаючага да солтыса, які са сваім заступнікам адвёў яго на пастарунак паліцыі ў в. Пронькі.

Прывёўшы да пастарунку, солтыс усунуў у руку праступіка адабраны рэвальвэр, адчыніў дзьверы і ўпхнуў яго ў памяшчэньне.

Паліцыянты, убачыўшы чалавека з рэвальвэрам у руцэ (трэба зазначыць, што рэвальвэр засекся і не працаваў), зусім страціліся і так перапалохаліся, што кінуліся хто куды — хто за печ, хто пад лаву, а хто да вакна; ні водзін з іх ня кінуўся да аружжа. Нейкі час трывала поўнае здуменьне, пакуль паліцыянты ачунялі ад страху. Потым толькі пачаўся дапрос ня менш здумлёнага „бандыта“.

Цікава, што было-б, каб паліцыянтам у Проньках прыйшлося спаткацца з запраўдным бандытам, які мог-бы хутка з'арыентавацца ў сытуацыі і крыкнуць: „ręce do góry!“

Пасьля гэтага ці прыходзіцца дзівіцца таму, што зрабілася з цягнікам каля Лунінца?!

Падарожны.

Рэдактар-Выдавец **Антон Война.** Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.